МОГИЛЕВСКИЙ ЗАГС БРОНИРУЕТ ВРЕМЯ НА БРАК ПО ИНТЕРНЕТУ

Могилёвский отдел ЗАГС запустил интернет-сервис mogilev.zags.by. Ресурс доступен в любое время дня и ночи.



«Эта страница поможет быстро, не вставая с дивана, забронировать дату регистрации своего брака, - рассказала начальник отдела ЗАГС Могилёвского горисполкома Галина Оношко. - Молодожёны смогут сами оценить свободные даты, выбрать время и зал регистрации. Также данный сервис поможет им получить важную юридическую информацию необходимую для подачи заявления и для регистрации брака».

Выбрать можно и вид регистрации на свой вкус от торжественной церемонии до выездной.

«После бронирования даты молодожёны получают развёрнутое сообщение, где указано, когда необходимо явиться в отдел ЗАГС в соответствии с требованиями законодательства для того, чтобы подать заявление на регистрацию брака», - отметил учредитель и правообладатель бренда zags.by Илья Костенич.

К слову, встать с дивана парам, пожелавшим вступить в брак, всё же придётся. В течение месяца хотя бы один из них должен лично подтвердить забронированную дату в ЗАГСе. Это позволит исключить бронирование нескольких дней одним человеком.

Кроме удобства, в данном случае есть ещё один немаловажный аспект - прозрачность работы по предварительной записи. Статистику по загруженности того или иного дня может увидеть теперь любой желающий.

А ещё из бонусов - информация об услугах и тарифах отдела, шаблоны требуемых документов и прямая интернет-связь с сотрудниками ЗАГСа - получить ответ на любой интересующий вопрос можно в течение 10 минут.

Похожий ресурс уже апробировали в столичных ЗАГСах, но особенность могилёвского предложения в том, что бронирование осуществляется не только онлайн, но и при личном присутствии, и по телефону.

НА МОГИЛЕВЩИНЕ ПЛАНИРУЕТСЯ ПОСТРОИТЬ ДВЕ ГИДРОЭЛЕКТРОСТАНЦИИ

Две гидроэлектростанции планирует построить в Могилевской области Минэнерго с привлечением прямых иностранных инвестиций. Эти планы отражены в стратегии развития энергетического потенциала Беларуси.



Одну из них - Могилевскую ГЗС мощностью 5,1 МВт - возведут на реке Днепр. Предполагаемый объем инвестиций данного проекта составляет 29,4 млн долларов США. На строительство второй - Шкловской ГЭС тоже на реке Днепр необходимо 28 млн долларов. Ее мощность составит 4,9 МВт.

В целом в ближайшее время Министерство энергетики Беларуси планирует реализовать шесть крупных проектов по строительству гидроэлектростанций с привлечением прямых иностранных инвестиций. Реализация их запланирована на 2016-2019 годы.

Расчетная годовая выработка электроэнергии указанными станциями равна 351,5 млн кВт.ч. С вводом их в эксплуатацию годовая выработка электроэнергии ГЭС в республике к 2020 году составит порядка 860 млн кВт.ч.

Строительство и запуск в работу ГЭС позволит снизить импортоемкость электроэнергетики за счет замещения импортируемых топливно-энергетических ресурсов, снизит выбросы загрязняющих веществ в атмосферный воздух.

НАШ МАГІЛЁЎ

http://gazetanm.eu
№89

Незалежнае грамадска-палітычнае выданне горада. 15 снежня 2015 г.

Надрукавана на ксераксе.
Наклад 299 ас.
Адрас рэдакцыі: Магілёў, вул. Ленінская, 29.
Распаўсюджваецца бясплатна.
gazetanm.eu@gmail.com

Галоўны рэдактар - Вітольд Наўрыда

ГРАМАДСТВА

МІЛІЦЫЯ ПРОСІЦЬ ДАПАМАГЧЫ ВЫЯВІЦЬ ФАКТЫ КРАДЗЯЖОЎ НА МАГІЛЁЎСКІМ МЯСАКАМБІНАЦЕ

У Магілёве органы ўнутраных спраў звярнуліся да грамадзян з просьбай паведамляць пра вядомыя ім факты карупцыі на Магілёўскім мясакамбінаце.



Напрацягу гэтага года праваахоўныя органы паведамлялі аб раскрытых на ААТ «Магілёўскі мясакамбінат» шматлікіх выпадках крадзяжоў, звязаных са злоўжываннем, перавышэннем улады або службовых паўнамоцтваў, якія прывялі да нанясення ўрону ў асабліва буйным памеры.

Як паведамляе сайт Упраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама, супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС неадназрова выкрываліся факты супрацьпраўнай дзейнасці з прыкметамі карупцыйных злачынстваў, учыненых службовымі асобамі ААТ «Магілёўскі мясакамбінат». Па ўсіх выяўленых фактах УСК Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці распачатыя крымінальныя справы, якія знаходзяцца ў вытворчасці. Канчатковыя сумы ўрону высвятляюцца.

Зараз аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы ў дачыненні да службовых асоб і іншых грамадзян, магчыма, датычных да выяўленых крымінальных схем, працягваюцца.

Міліцыя просіць грамадзян паведаміць любую інфармацыю аб супрацьпраўнай дзейнасці, звязанай з ААТ «Магілёўскі мясакамбінат», па тэлефонах +375-222-29-56-17, +375-029-585-24-28 або 102. Ва УУС заяўляюць пра гарантыі ўзнагароджання інфарматарам і выканання ананімнасці.

Нагадаем, што ў лістападзе паведамлялася, што следчыя органы завяршылі расследаванне справы старшыні наглядальнага савета ААТ «Магілёўскі мясакамбінат», абвінавачванага разам са сваім сынам у крадзяжы прадукцыі прадпрыемства на 600 млн. рублёў.

Таксама ў лістападзе намеснік дырэктара мясаперапрацоўчага прадпрыемства была абвінавачаная ў буйным крадзяжы шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі. Сума ўрону высвятляецца, але, паводле папярэдніх звестак, размова ідзе пра мільярды рублёў.

У канцы мая ў крадзяжы некалькіх мільярдаў рублёў была абвінавачаная загадчыца магазіна фірмовага гандлю Магілёўскага мясакамбіната.

СВЕТЛАНА АЛЕКСИЕВИЧ ПОЛУЧИЛА НОБЕЛЕВСКУЮ ПРЕМИЮ



Писательнице Светлане Алексиевич вручены медаль и диплом Нобелевского лауреата. Церемония награждения прошла 10 декабря в Концертном зале Стокгольма.

8 октября Нобелевский комитет объявил о решении присуждении премии по литературе Алексиевич за «многоголосое звучание ее прозы и увековечивание страдания и мужества».

Лауреаты награждаются в определенном порядке - физика, химия, медицина, литература, экономика. В таком же порядке они появились на сцене в начале церемонии. Премию мира ранее уже вручили в Осло.

По традиции каждого лауреата представляет известный в его сфере деятель. Светлану Алексиевич представил шведский писатель Пер Вестберг. Перед ее награждением прозвучала ария Ленского из оперы Чайковского «Евгений Онегин».

Белорусские государственные телеканалы приняли решение не показывать в прямом эфире мероприятия Нобелевской недели.

ІНЖЫНЕР ФІЛІЯЛА ААТ «БАБУШКИНА КРЫНКА» ПАДАЗРАЕЦЦА Ў 20 ЗЛАЧЫНСТВАХ

Дваццаць крымінальных спраў распачата ў дачыненні да вядучага інжынера па транспарце філіяла «Бабруйскі» ААТ «Бабушкина крынка», западозранага ў карупцыі, паведаміў 8 снежня ў Магілёве на круглым стале па пытаннях выканання антыкарупцыйнага заканадаўства ў сферы адукацыі намеснік начальніка ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Слонімскі.



У ліпені супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі вядучага інжынера філіяла «Бабруйскі» ААТ «Бабушкина крынка» пры незаконным атрыманні ім грошай ад падначаленых, раней паведаміла афіцыйны прадстаўнік УСК па Магілёўскай вобласці Аксана Салянюк.

Паводле слоў Слонімскага, справы, якія расследуюцца, датычацца атрымання хабараў, крадзяжоў, злоўжывання і перавышэння ўлады. «Там шэраг фактаў, што ён атрымліваў хабары ад падпарадкаваных работнікаў, у прыватнасці ад вадзіцеляў, каб налічвалася прэмія, палову якой забіраў. Гэта было на патоку паўтара года - колькі ён там працаваў. Гэтую схему ён прыдумаў, і ўсё плацілі яму грошы. Таксама ўстаноўленыя крадзяжы паліва, грашовых сродкаў, калі незаконна пералічваліся грошы з яго дапамогай фірме, што аказвала паслугі па мыцці грузавых аўтамашын», - паведаміў прадстаўнік абласной міліцыі.

Акрамя таго, распачата справа па факце атрымання хабару ў дачыненні да іншага інжынера ААТ «Бабушкина крынка». «На працоўным месцы ён атрымліваў ад грузчыка 20 тыс. расійскіх рублёў за рашэнне пытання пра вываз выкрадзенай прадукцыі з тэрыторыі прадпрыемства. Пры гэтым быў учынены крадзеж», - паведаміў Слонімскі.

МОГИЛЕВСКИЕ ВЛАСТИ АНОНСИРОВАЛИ ПОВЫШЕНИЕ СТОИМОСТИ ПРОЕЗДА

Проезд в городском общественном транспорте Могилёва станет дороже в конце декабря. Более точную дату горожанам сообщат дополнительно, пояснил главный специалист отдела транспорта и коммуникаций Моноблисполкома Василий Калгин. Талон на одну поездку будет стоить 4 тыс. рублей.



Стоимость проездных билетов:

- полный месяц, один вид транспорта - 180 тыс. рублей;
- полный месяц, комбинированный - 240 тыс. 200 рублей;
- полный месяц, рабочего дня, один вид транспорта - 144 тыс. рублей;
- полный месяц, рабочего дня, комбинированный - 192 тыс. 100 рублей;
- полмесяца, один вид транспорта - 96 тыс. рублей;
- полмесяца, комбинированный - 126 тыс. 600 рублей;
- полмесяца, рабочего дня, один вид транспорта - 76 тыс. 800 рублей;
- полмесяца, рабочего дня, комбинированный - 101 тыс. 400 рублей;
- декада, один вид транспорта - 63 тыс. 300 рублей;
- декада, комбинированный - 84 тыс. 600 рублей;
- декада, рабочего дня, один вид транспорта - 50 тыс. 900 рублей;
- декада, рабочего дня, комбинированный - 67 тыс. 800 рублей.

Категории граждан, имеющие право на бесплатный проезд, остались прежними.

Стоимость проезда в маршрутных такси индивидуальные перевозчики установят самостоятельно, исходя из спроса, но не нарушая законодательство.

КАЛЯ 300 КАРУПЦЫЙНЫХ ЗЛАЧЫНСТВАЎ ВЫЯЎЛЕНА Ў МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ З ПАЧАТКУ ГОДА

З 791 эканамічнага злачынства, зарэгістраванага сёлета ў Магілёўскай вобласці, 283 маюць прыкметы карупцыі, паведаміў у Магілёве на круглым стале па пытаннях выканання антыкарупцыйнага заканадаўства ў сферы адукацыі намеснік начальніка ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Слонімскі.

Паводле яго, у ліку карупцыйных злачынстваў было 113 крадзяжоў, учыненых шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, 41 злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі, 19 выпадкаў перавышэння ўлады, 108 фактаў хабарніцтва. «Устанавілі ўрон па завершаных крымінальных справах на 28,4 млрд. рублёў. Пакрылі амаль 12 млрд. рублёў і наклалі арышт на маёмасць прыцягнутых асоб на 41 млрд. рублёў», - сказаў Слонімскі. Ён адзначыў, што галоўным фактарам матывацыі да злачынстваў карупцыйнай скіраванасці з'яўляецца карысць. Ёсць таксама арганізацыйна-кіраўніцкія прычыны і ўмовы карупцыйнай злачыннасці. Сярод іх, у прыватнасці, адсутнасць празрыстасці дзейнняў улад, эфектыўных прававых механізмаў зняцця карумпаваных службовых асоб. Ёсць таксама псіхалагічныя прычыны і ўмовы: шматвяковая гісторыя хабарніцтва, нізкі ўзровень салідарнасці насельніцтва з барацьбой па гэтай з'яве, псіхалагічная гатоўнасць значнай часткі насельніцтва вырашыць пытанне як законным, так і незаконным спосабам пры дапамозе службовых асоб.



Слонімскі паведаміў пра шэраг карупцыйных спраў, раскрытых праваахоўнымі органамі Магілёўскай вобласці за апошні час. Так, быў выяўлены крадзеж на 190 млн. рублёў на заводзе «Трансмаш». «Задакументавалі крадзеж з боку намесніка начальніка цэха на ААТ «Магілёўхімвалакно», - адзначыў прадстаўнік абласнога УУС.

Паводле яго слоў, прадухіленыя факты ўчынення злачынстваў начальнікам філіяла «Будаўнічамантажны поезд № 761» на станцыі Магілёў, які, паводле даных міліцыі, атрымліваў хабары ад кіраўнікоў камерцыйных структур за заключэнне дагавораў на пастаўку прадукцыі. Таксама, як мяркуюць у міліцыі, старшыня праўлення СЖБК «Саломінка» перавысіў паўнамоцтвы і нанёс урон у памеры 200 млн. рублёў пры будаўніцтве жылога дома.

Была распачатая крымінальная справа па факце злоўжыванняў у дачыненні да галоўнага інжынера Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў, які, як мяркуецца, парушыў закон пры закупцы неабходных камплектуючых дэталяў, чым нанёс значны ўрон.

Урон у 4,75 млрд. рублёў выяўлены на шклоўскім заводзе газетнай паперы, дзе з парушэннем заканадаўства адпускалася прадукцыя адной латвійскай фірме.

Як адзначыў начальнік аддзела па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю пракуратуры Магілёўскай вобласці Андрэй Воўкаў, сферы адукацыі і аховы здароўя, насуперак распаўсюджанаму стэрэатыпу, не з'яўляюцца цяпер самымі карумпаванымі. «Усе сферы схільныя да гэтай з'явы, і найболей - прамысловасць, сельская гаспадарка, дзяржкіраванне. Хоць сёлета па дзяржкіраванні менш фактаў», - падкрэсліў ён.

НА 21 ПРЕДПРИЯТИИ МОГИЛЕВСКОЙ ОБЛАСТИ ЗАДЕРЖКИ С ВЫПЛАТОЙ ЗАРПЛАТЫ

По состоянию на 1 декабря 2015 года в 405 организациях страны допущена просроченная задолженность по заработной плате перед 69,1 тыс. работниками.

Сумма составила Br241,4 млрд. (1,2% от фонда заработной платы по республике за октябрь 2015 г.). Организации и предприятия лишь Брестской области смогли вовремя рассчитаться с работниками. Максимальное количество «зарплатных» должников в Минской и Витебской областях, 173 и 142 соответственно. В Могилевской области 21 предприятие имеет просроченную задолженность по заработной плате на общую сумму Br12 838,9 млн., сообщает Белстат (7 - в Осиповичском, 4 - в Могилевском, 3 - в Бобруйском, по 2 - в Белыничском и Быховском, по одному - в Климовичском, Краснопольском и Хотимском районах).

В целом по республике наибольшее количество организаций, допустивших просроченную задолженность по заработной плате, в отраслях сельского хозяйства, охоты и лесного хозяйства - 338, в строительстве - 31, промышленности - 26.

ПЁТР МИГУРСКИЙ: КОРРУПЦИЯ В МОГИЛЁВСКОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ

Ведущее место в экономике Могилевской области занимает промышленность – на её долю приходится 35% валового регионального продукта. Предприятия области специализируются на производстве вагонов, лифтов, прицепной сельхозтехники, пневматических резиновых шин, стальных труб, цемента, шифера, электродвигателей, химических волокон и нитей, тканей, продуктов питания.



Пётр Мігурскі - эксперт

Промышленность имеет огромный экономический потенциал и является главным объектом инвестиционных вложений - вряд ли стоит сомневаться в актуальности вопроса борьбы с коррупцией в отрасли. Особенно важна антикоррупционная борьба в государственном секторе, где находится наибольший объём денежных и материальных ресурсов, а также производится половина промышленной продукции нашей области. В промышленности, вследствие коррупционных проявлений, наносится наиболее существенный материальный ущерб государству, размер которого порой исчисляется десятками миллионов долларов США только на отдельно взятом предприятии. Таким образом, стабильность работы предприятий промышленности не только экономическая, но и уголовно-правовая проблема нашего общества.

Могилёвская область в достаточной степени подвержена проявлениям коррупции в промышленности - среди должностных лиц предприятий правоохранительными и контролирующими органами выявляется ежегодно от 27 до 74 коррупционных преступлений. За последние годы в Могилёвской области за преступления коррупционного характера привлечены к уголовной ответственности руководители и специалисты предприятий различных отраслей и форм собственности.

За злоупотребление служебными полномочиями к 12 годам лишения свободы приговорён бывший генеральный директор «Кричевцементношифера» Леонид Скоцкий. По данным следствия, Леонид Скоцкий, занимаясь поборами и взятками, незаконно получил в общей сложности 214 миллионов рублей.

В 2014 году признан виновным и осужден на 7 лет генеральный директор ОАО «Холдинг Могилевводстрой» Евгений Зюзин, который в 2012 году неоднократно получал взятки на сумму более 400 000 рос. руб. за положительное решение вопросов о заключении договоров на оказание транспортных услуг и осуществление рекультивации земель в Республике Коми (РФ).

Осуждены за экономические преступления бывшие генеральные директора ОАО «Кожевник» (Галина Вишневецкая), ОАО «Фандок» (Владимир Майко), ОАО «Могилёвдрев» (Андрей Усов).

В настоящее время возбуждён ряд уголовных дел по коррупции на предприятиях промышленности области:

- получение взятки в размере 4,4 тыс. дол. США за обещание решения вопроса приобретения электротехнической продукции у российской фирмы стало причиной задержания главного энергетика «Могилёфлифтмаша»;

- по признакам состава преступления, предусмотренного ч.3 ст.426 УК (превышение власти или служебных полномочий, повлекшее тяжкие последствия), в отношении бывшего заместителя директора РУП «Завод газетной бумаги» (Шклов) – ущерб на сумму более 280 тыс. евро;

- за злоупотребление служебными полномочиями возбуждено уголовное дело в отношении директора одного из коммунальных предприятий (Могилев) и учредителя ООО «Доринвест» - причинение ущерба на сумму более 24 тыс. дол. США;

- уголовное дело возбуждено в отношении ведущего инженера филиала «Бобруйский» ОАО «Бабушкина крынка» по ч.2 ст.424 УК - «Злоупотребление служебными полномочиями». Руководитель задержан в служебном кабинете в момент получения денежных средств в сумме более 3 млн. руб. Установлено, что обвиняемый давал незаконные указания подчинённым организовывать на системной основе сбор и передачу ему денег из премиальных выплат. Преступную схему ведущий инженер использовал около двух лет и незаконно получил более 180 мил. Руб.;

- возбуждено уголовное дело в отношении начальника отдела одного из коммунальных предприятий города (Могилёв) за нанесение ущерба на сумму более 65 тыс. дол. США;

- за последнее время от управления ОАО «Бобруйский мясокомбинат» отстранили от работы 2-х директоров: первый из них подозревается в превышении власти с причинением ущерба предприятию на сумму более 22 млрд. руб., второй попал под уголовную статью за попытку хищения партии колбасных изделий с территории мясокомбината, по которому суд уже вынес приговор. Директор ОАО «Бобруйский мясокомбинат» Виктор Ходасевич и главный технолог предприятия Оксана Дзыгун обвинены в покушении на хищение путем злоупотребления служебными полномочиями, совершенном группой лиц по предварительному сговору.

В ходе следствия и суда было установлено, что Ходасевич на своем рабочем месте дал главному технологу указание подготовить для него к новогодним праздникам по несколько батонов копченой и вареной колбасы, копченые мясные изделия, фарш, мясо, языки и другую продукцию. Дзыгун, в свою очередь, дала соответствующие поручения начальнику колбасно-кулинарного цеха и другим подчиненным.

Продукты скрытно перенесли в гараж на территории предприятия, в служебный микроавтобус Volkswagen директора. Водителю Ходасевич дал указание выехать с территории и оставить автомобиль возле административного здания комбината. При выезде через проходную микроавтобус с грузом задержали сотрудники департамента охраны, которые уже владели информацией о предполагаемом хищении. Мясопродукты на сумму 1 904 140 рублей изъяли.



38-летний директор проработал в этой должности всего 1,5 месяца. До этого он также работал на мясокомбинате, в том числе главным инженером.

Суд приговорил Виктора Ходосевича к 2 годам лишения свободы с отбыванием наказания в исправительной колонии в условиях усиленного режима со штрафом в доход государства в размере 18 млн рублей. Оксане Дзыгун также назначено 2 года лишения свободы и 18 миллионов рублей штрафа, но с отсрочкой исполнения основного наказания сроком на 2 года.

Практически в каждом районе области выявляются преступления коррупционной направленности, что говорит о системности данного вида преступлений. В чём причины этого негативного явления? Представляется, что многие из них вытекают из тех условий, которые созданы для работы должностных лиц государственных промышленных предприятий самим государством, которое не обеспечивает должный контроль за их работой, несвоевременно и не всегда в должной мере выявляет совершённые должностными лицами правонарушения. Не всегда объективно расследуются уголовные дела, связанные с коррупционными и иными преступлениями в промышленности. Следует также признать и активное влияние преступной среды на должностных лиц предприятий.

Среди наиболее распространённых причин и условий совершения коррупционных преступлений – ненадлежащее исполнение должностными лицами своих служебных обязанностей, отсутствие в организациях строгого контроля за соблюдением законодательства, регламентирующего ведение делопроизводства и бухгалтерского учёта, отсутствие контроля за целевым и эффективным использованием товарно-материальных ценностей и финансовых ресурсов.

В структуре коррупционной преступности основную долю (до 80%) составляют хищения путем злоупотребления служебными полномочиями - это свидетельство очень опасных и скрытых проявлений коррупции среди должностных лиц как отдельно взятого предприятия, так и всей промышленности в целом.

Значительную долю коррупционных преступлений в промышленности составляют уголовно-наказуемые деяния, совершаемые руководителями предприятий при освоении бюджетных и собственных средств в ходе модернизации производства. Например, при строительстве мясожирового цеха Бобруйского мясокомбината объём выполненных работ был завышен на 600 млн. руб.

Руководители госпредприятий и специалисты, связанные с закупкой сырья и материалов у частных фирм, имеют неплохие доходы от самого факта закупок – мелкая коррупция стала неотъемлемой частью работы снабженцев. В итоге, на предприятие поступает не всегда качественная продукция, что влияет на конкурентоспособность выпускаемых изделий. При этом небольшой круг менеджеров получает колоссальные доходы на фоне нищенских зарплат работников предприятий. Проблема достигла таких масштабов, что председатель Могилёвского облисполкома Владимир Доманевский вынужден признать: взяточничество, проявление личных интересов должностных лиц при проведении тендеров и закупок имеет негативные последствия не только для конкретных предприятий области, но и для экономики страны.

Продолжение в следующем номере

КАРУПЦЫЯНЕР ДУПЛЕЎСКІ АДКУПІЎСЯ АД ПАКАРАННЯ

Былы начальнік упраўлення адукацыі Магілёўскага гарвыканкама Яўген Дуплеўскі, абвінавачаны ў карупцыйным злачынстве, памілаваны прэзідэнтам.



У лютым 2014 года абласная пракуратура паведаміла аб распачынанні ў дачыненні да чыноўніка крымінальнай справы на падставе часткі 2 артыкула 210 КК (крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, учынены паўторна або групай асоб па папярэдняй змове). Следства ўстанавіла, што Дуплеўскі на працягу чатырох вучэбных гадоў, у 2010-2013 гадах, афармляўся ў школу на працу па сумяшчальніцтве настаўнікам факультатыўных заняткаў на ўмовах тэрміновага працоўнага дагавора, пры гэтым фактычна такія заняткі з вучнямі не праводзіў.

У школе афармлялася фіктыўная службовая дакументацыя, якая з'явілася падставай для налічэння яму заработнай платы і ажыццяўлення абавязковых адлічэнняў у бюджэт на агульную суму каля 22 млн. рублёў. Пасля былы чыноўнік, прызнаўшы сваю віну ў крадзяжах, падаў прэзідэнту прашэнне аб памілаванні.

«Памілаваны яшчэ вясной гэтага года. Гэта значыць, што ён пакрыў урон ў двухразовым ці трохразовым памеры», - заявіў начальнік аддзела па барацьбе з карупцыяй пракуратуры Магілёўскай вобласці Андрэй Волкаў.

Санкцыя артыкула, паводле якой абвінавачваўся Дуплеўскі, прадугледжвае да сямі гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

МАГІЛЁЎСКАЙ ДАБРАЧЫННАЙ АРГАНІЗАЦЫІ «ВОДГУК» ПАГРАЖАЕ ЛІКВІДАЦЫЯ

Галоўнае ўпраўленне юстыцыі Магілёўскага аблвыканкама адмовілася зарэгістраваць змены, якія былі ўнесены ў Статут арганізацыі ў сувязі са зменай юрыдычнага адраса.



У сувязі з гэтым праўленне Магілёўскай гарадской дабрачыннай грамадскай арганізацыі «Водгук» звярнулася са скаргай у Магілёўскі абласны суд. Суд адбудзецца 15 снежня ў 14-30.

Праз суд кіраўніцтва арганізацыі хоча прызнаць рашэнне рэгіструючага органа аб адмове ў рэгістрацыі зменаў, якія былі ўнесены ў Статут арганізацыі неправамернымі і парушаючымі правы грамадзян; абавязаць дзяржаўны орган правесці дзяржаўную рэгістрацыю зменаў, якія былі ўнесены ў Статут арганізацыі, а судовыя выдаткі, звязаныя з гэтай справай, ускласці на рэгіструючы орган.

Са словаў праваабаронцы Барыса Бухеля, чыноўнікам не спадабалася тое, што прапанаваны новы юрыдычны адрас ўжо займае Магілёўскі праваабарончы цэнтр, і гэта з'яўляецца падставай для таго, каб не задаволіць рэгістрацыю зменаў у Статуце.

Тым часам, існуе дэкрэт №1 прэзідэнта ад 16 студзеня 2009 года «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання», які дазваляе гэта рабіць.

Довады аб тым, што некалькі грамадскіх арганізацый адначасова могуць размяшчацца па адным юрыдычным адрасе былі прызнаны Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь 4 верасня 2000 года па скарзе заснавальнікаў Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Беларускае аб'яднанне маладых палітыкаў» на рашэнне Мінюста аб адмове ў рэгістрацыі. З 2000 года нормы Грамадзянскага кодэкса ў дадзенай галіне не змяніліся.

Трэба адзначыць, што дабрачынная арганізацыя «Водгук» 27 верасня 2015 года звярталася ў Галоўнае ўпраўленне юстыцыі Магілёўскага аблвыканкама з заявай аб рэгістрацыі зменаў у Статуце, аднак ужо 29 верасня ва ўнясенні падобных зменаў у Статут арганізацыі было адмоўлена.

СПРАВА ГЕНДЫРЭКТАРА "КРЫЧАЎЦЭМЕНТНАШЫФЕРА": ВОДГУК ТРЫЦЦАТЫХ ГАДОЎ

Чым падобныя працэсы над гендырэктарам прадпрыемства "Крычаўцаментнашыфер" Леанідам Скоцкім з працэсамі на былымі паплечнікамі Сталіна? І там, і там фігуранты мелі ўладу і былі ўзвышаныя, і ад тых, і ад тых пры распачатку крымінальнай справы ўсе адвярнуліся, і тыя, і тыя спадзяваліся на літасць уладара, і тыя, і тыя аказаліся пакаранымі.



"Крычаўцэментнашыфер" - прадпрыемства, што значыць для невялікага Крычава вельмі многа. Яго ячшэ называюць горадаўтваральным, зважаючы на вялікую колькасць працоўных месцах, а таксама ўнёсак у бюджэт. Таму, зразумела, што ўзначаліць прадпрыемства мог толькі чалавек, якого ўлада добра ведала. Такім і быў Леанід Скоцкі. Ён з 2003 па 2009 гады займаў пасаду намесніка старшыні Крычаўскага райвыканкама, а потым стаў намеснікам гендырэктара "Крычаўцэментнашыферу".

Калі пачытаць пра Скоцкага ў інтэрнэце матэрыялы, датаваныя раней за верасень 2013 году, то ўражанне такое – асядлаў чалавек удачу і паскача на ёй аж да выйсця на пенсію і нават далей. І жонка ў яго "не лыкам шытая" – працавала дырэктарам мясцовай музычнай школы. А як адзін з этапаў вялікага паспяховага шляху – званне "Чалавек году 2012" Крычаўскага раёна.

Нішто не ўказвала на праблемы нават у жніўні 2013 году, калі разам з пажыццёвым прэзідэнтам рука ў руку націскаў Скоцкі сімвалічную пускавую кнопку другой тэхналагічнай лініі.

Можна толькі падзівіцца цынічнасці і крывадушнасці вышэйшага кіраўніцтва краіны, якое, без сумневу, добра ведала летам 2013 году з кім мела справу. Бо ўжо ў верасні таго года Скоцкі быў узяты пад варту. Яму інкрымінавалі злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі і атрыманне хабару. Паводле даных следства, ён незаконна атрымаў у агульнай складанасці 214 мільёнаў рублёў. Следчыя ўстанавілі, што падазраваны замешаны ў 12 эпізодах пабораў грашовых сродкаў з прэмій завадчан.



У "лепшых" традыцыях 1930-х мясцовыя ўлады ячшэ да вынясення прыгавора пазбавілі яго звання "Чалавек года". Пытанні – "навошта", "а раптам следчыя памыліліся" перад былымі паплечнікамі не стаяла. Магчыма, ім больш чым каму вядомыя парадкі цяперашняй улады, - калі пашча адкрытая, то не трэба заступацца за "ахвярнага казла".

А Скоцкі аказаўся ў ролі "ворага народа", якога следчыя ўгаварылі пакаяцца, то бок прызнаць віну са спадзевам на памілаванне Лукашэнкі. Гэта былы гендырэктар і зрабіў, хаця, калі б добра вучыў гісторыю, то ведаў бы, што такія раскаянні патрэбны толькі для аднаго – прызнання віны, а не задавальненні просьбы аб памілаванні.

На судзе некалькі дзесяткаў чалавек сведчылі супраць былога гендырэктара, абвінавачваючы яго ў тым, што забіраў частку выплачаных прэміяльных. Спробы Скоцкага давесці, што так рабіў і ягоны папярэднік ні да чаго не прывялі. Таксама толькі ўсмешку маглі выклікаць яго сцвярджэнні аб агаворы самога сябе з надзеяй на памілаванне.

У выніку Леанід Скоцкі быў асуджаны да дзесяці гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у калоніі ўзмоцненага рэжыму, з канфіскацыяй маёмасці і забаронай на працу пяці гадоў займаць пасады, звязаныя з кантрольна-размеркавальнымі функцыямі. Амністыя скасавала яму адзін год.

Зараз Скоцкі ў калоніі. Яго жонка, якая ў хуткім часе пасля арышта мужа была адсунута з пасады дырэктара музычнай школы на пасаду выкладчыка, перабралася ў Магілёў.